УДК 023-057.86

*Ю. А. ПЕРАВЕРЗЕВА*

# ПРАБЛЕМА САМАРЭАЛІЗАЦЫІ СПЕЦЫЯЛІСТА Ў БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЕ

*Раскрыты тэарэтыка-метадычныя аспекты самарэалізацыі бібліятэкара на сучасным этапе развіцця бібліятэчнай справы. Самарэалізацыя прадстаўлена як мэтанакіраваны працэс удасканалення прафесійных кампетэнцый і асобасных якасцей бібліятэчнага спецыяліста. Апісаны фактары, якія ўплываюць на гэты працэс.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ва ўмовах сучаснага цывілізацыйнага развіцця адбываецца пераарыентацыя грамадства на прафесіяналізм. Як адзначае У. А. Цвык, «... ва ўсіх без выключэння сферах працоўнай дзейнасці вядучым становіцца чалавечы фактар. Расце зацікаўленасць грамадства ў прафесіяналах – работніках не толькі з высокімі прафесійнымі навыкамі, але і з аналітычнымі, творчымі здольнасцямі, устойлівай светапогляднай базай і гуманістычнымі вартаснымі арыенцірамі» [12]. Да таго ж дынаміка грамадскіх патрабаванняў да пэўнай прафесіі, на наш погляд, грунтуецца на дасягненнях навукова-тэхнічнага, інтэлектуальнага і сацыяльнага развіцця грамадства. Сучасная сацыяльна-эканамічная сітуацыя, якая характарызуецца абвастрэннем канкурэнтаздольнасці на прафесійным рынку працы, ставіць на першы план высокія патрабаванні да такіх якасцей чалавека, як здольнасць да саморазвіцця і самаўдасканалення, як вынік яго прафесійнай самарэалізацыі.

Самарэалізацыя ўвогуле і самарэалізацыя прафесіяналаў у розных галінах дзейнасці з’яўляецца прадметам навукова-даследчых распрацовак псіхолагаў, педагогаў, акмеёлагаў, філосафаў, сацыёлагаў і прадстаўнікоў іншых навуковых галін, якія вывучаюць чалавека [3; 4; 6; 11]. У ракурсе іх тэарэтыка-эмпірычных поглядаў знаходзяцца палажэнні, якія маюць значэнне і для будучага бібліятэчнай справы: прафесія як сфера самарэалізацыі чалавека; прафесійнае самавызначэнне асобы як ступень самарэалізацыі прафесіянала; самарэалізацыя і механізмы дэтэрмінацыі асобаснага патэнцыялу работніка.

Трэба адзначыць, што ў бібліятэказнаўстве праблематыка прафесійнай самарэалізацыі бібліятэкараў атрымала даследчы статус у апошнія некалькі гадоў у сувязі з абгрунтаваннем місіі сучаснай бібліятэкі, дзе асобая ўвага надаецца бібліятэкару як носьбіту інфармацыйнай культуры, спецыялісту, здольнаму актыўна выкарыстоўваць інфармацыйныя тэхналогіі, прадугледжваць запыты і патрабаванні карыстальнікаў, хутка прымаць

markdown
рознага кшталту рашэнні ў сувязі з ускладненнем мэт і задач функцыянавання ва ўмовах канкурэнтнага асяроддзя.

Самарэалізацыя бібліятэкара ў якасці комплекснай бібліятэказнаўчай праблемы не вывучалася айчыннымі і замежнымі навукоўцамі. Яна разглядаецца як адзін з кампанентаў у бібліятэказнаўчых публікацыях, якія маюць дачыненне да кіравання развіццём бібліятэчнага персаналу і фарміравання прафесійных якасцей бібліятэкараў [10], стварэння прафесійнакваліфікацыйнай структуры бібліятэчных кадраў [5], станаўлення бібліятэкара ў блоку прафесій тыпу «чалавек – знакавыя сістэмы – чалавек» [2].

Пры гэтым, мы лічым, існуе аб'ектыўная патрэбнасць у выяўленні сутнасных адметнасцей самарэалізацыі спецыяліста ў бібліятэчнай справе, умоў і этапаў ажыццяўлення кірунку псіхолага-педагагічнай дзейнасці бібліятэкі па рабоце з персаналам.

Асноўнымі тэзісамі, якія, на наш погляд, характарызуюць прафесійную самарэалізацыю, з'яўляюцца:

– рэалізацыя (realization) – кагнітыўная (разумовая) дзейнасць, усведамленне задумы, атрыманага выніку [3];

– сістэмнасць вывучэння асобы і дзейнасці (Б. Г. Ананьеў, Б. Ф. Ломаў), адзінства свядомасці і дзейнасці (А. М. Лявонцьеў, С. Л. Рубінштэйн), цэласнасць вывучэння асобы (А. Р. Кавалёў, В. С. Мерлін);

– значнасць матывацыйных фактараў, якія ўплываюць на працэс прафесійнага станаўлення дарослага чалавека, і сістэмы каштоўнасных арыентацый, што садзейнічае самарэалізацыі асобы.

Развіццё патэнцыялу асобы, у тым ліку ў прафесіі, на працягу яе жыцця з'яўляецца актуальным аспектам педагагічных і андрагагічных даследаванняў.

Самарэалізацыя спецыяліста мае акмеалагічны пачатак, калі праз прызму фактараў і ўмоў дасягнення вяршынь яго сталасці адбываецца працэс самаактуалізацыі асобы (І. А. Зімняя, А. А. Дзеркач).

Самарэалізацыя бібліятэкара адбываецца на розных этапах яго жыццядзейнасці. З аднаго боку, самаўдасканаленне і далейшая самарэалізацыя матывуюцца з боку кіраўніцтва бібліятэкі і органаў кіравання бібліятэчнай справай, з другога – жаданне самарэалізавацца, паказаць сваю значнасць у калектыве, у прафесійнай суполцы зыходзіць ад супрацоўніка, якую б пасаду ён не займаў (дырэктар, намеснік дырэктара, загадчык аддзела, галоўны спецыяліст, вядучы спецыяліст, спецыяліст 1 катэгорыі, спецыяліст 2 катэгорыі).

Адметнасць самарэалізацыі спецыяліста ў бібліятэчнай справе ў тым, што яна ўяўляе мэтанакіраваны працэс пастаяннага ўдасканалення прафесійных кампетэнцый (вытворча-тэхналагічных, сацыякультурных, навукова-метадычных, навукова-даследчых, арганізацыйна-кіраўніцкіх, педагагічных, інавацыйных), якія адпавядаюць пэўнаму ўзроўню прафесіяналізму і прафесійнаму стану спецыяліста, прафесіянала ці майстра, а таксама развіцця асобасных якасцей, якія дэтэрмінуюць эфектыўную, творчую, стваральную працу, фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі. Такім чынам, прадукцыйная самарэалізацыя забяспечвае прафесійнае і асобаснае развіццё бібліятэчнага спецыяліста як аднаго з кампанентаў сістэмы «бібліятэка». Пры гэтым прафесійнае самавызначэнне прыводзіць да раз-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзялення працы (каталагізатары, камплектатары, аўтаматызатары, супрацоўнікі аддзелаў абслугоўвання, метадысты), што, у сваю чаргу, садзейнічае ўзнікненню прафесійных груп, для якіх характэрна адзінства прафесійных задач. У мэтах іх аптымальнага і хуткага вырашэння ствараюцца каналы прафесійнай камунікацыі (спецыяльныя камітэты ў структуры Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, айчынны і замежны прафесійны друк, бібліятэчныя групы ў сацыяльных медыя і інш.), усталёўваюцца вертыкальныя і гарызантальныя сувязі паміж суб'ектамі прафесійнай прасторы.

Безумоўна, на працэс самарэалізацыі бібліятэчнага спецыяліста робіць уплыў стан бібліятэчнага сацыяльнага інстытута. На працягу некалькіх дзесяцігоддзяў адбываліся інстытуцыянальныя змяненні, што не спрыяла замацаванню статусу бібліятэкара ў грамадстве, які мяняўся ў залежнасці ад гістарычных умоў і палітычных фармацый. Таму сёння самаідэнтыфікацыя прафесіі, па меркаванні С. А. Басава, з'яўляецца асноўнай перадумовай фарміравання бібліятэкі як сацыяльнага інстытута ў сукупнасці кампанентаў: практыка, навука, адукацыя, камунікацыя, кіраванне. У гэтай сістэме бібліятэкару адводзіцца важная роля, звязаная з трансляцыяй функцый культуры ў грамадстве, зберажэннем нацыянальных традыцый, садзейнічаннем чалавеку ў рэалізацыі яго правоў [1]. Разам з тым бібліятэкар часцей за ўсё самарэалізуецца ў адпаведнасці са сваімі функцыянальнымі абавязкамі. Матывацыя, умовы самарэалізацыі, усведамленне і ацэнка ўласных рашэнняў і ўчынкаў становяцца вядучымі фактарамі пры выбары спосабаў дзеяння ў напрамку рэалізацыі «Я-канцэпцыі». Прывядзём некалькі прыкладаў.

Бібліятэкары вядуць актыўную навукова-даследчую дзейнасць, вынікі якой становяцца здабыткам прафесійнай грамадскасці на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых форумах (штогадовая навукова-практычная канферэнцыя маладых вучоных і спецыялістаў, арганізатарам якой з'яўляецца ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі; міжнародны кангрэс «Бібліятэка як феномен культуры», які праходзіць у НББ, і інш.); аказваюць метадычную дапамогу калегам, дзеляцца вопытам, што адбываецца падчас міжнародных семінараў-практыкумаў («Павышэнне кваліфікацыі: новыя ідэі і тэхналогіі ў дзіцячых бібліятэках», арганізатар – ДУ «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска»), абласных семінараў («Бібліятэчныя кадры: статус, выкарыстанне, навучанне», арганізатар – УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага», г. Брэст), курсаў павышэння кваліфікацыі пры ДУА «Інстытут культуры Беларусі», Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы, стажыровак, унутрыарганізацыйнага навучання, адукацыйных і прафесійна-азнаямляльных паездак, прэзентацый бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг.

Вопыт сведчыць, што бібліятэчны спецыяліст развівае патэнцыял ці пастаянна шукае шляхі яго рэалізацыі не толькі на працоўным месцы, але і ў асабістым жыцці. Устаноўлена, што прафесійнае развіццё бібліятэчных спецыялістаў складаны і працаёмкі працэс, рэгуляванне якім залежыць ад рыс асобы, яе самаацэнкі, маральнага стану, здольнасці да лідарства і г.д. Вынікі апытання, праведзенага сярод 450 супрацоўнікаў бібліятэк УВА Беларусі, гавораць аб тым, што рэалізацыя важных для спецыялістаў прафесійных каштоўнасцей звязваецца з магчымасцю павышаць сваю кваслі-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фікацыю, выкарыстоўваць веды і прафесійныя кампетэнцыі, працаваць па абранай спецыяльнасці. Ступень прафесійнай рэалізацыі спецыялістаў з'яўляецца даволі высокай і складае 54,9% [9, с. 10].

На лакальным узроўні таксама праводзяцца даследаванні прафесійнага патэнцыялу спецыялістаў, але, на жаль, яны не набываюць шырокай вядомасці. Так, напрыклад, лінейныя кіраўнікі УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага» (г. Брэст) зазначаюць, што іх падначаленыя ўдзяляюць увагу такім аспектам прафесійнага развіцця, як кіраванне сабой (веданне спецыфікі бібліятэкі, веданне і разуменне ўласных працоўных функцый і задач, якія трэба выконваць на працоўным месцы), тайм-менеджмент, прафесійныя паводзіны і камунікацыі, уменне задаваць пытанні самому сабе*.

Самарэалізацыя бібліятэкара-прафесіянала непарыўна звязана з чытаннем. Бібліятэкары – прадстаўнікі асобых сацыяльна-прафесійных груп, для якіх характэрна прафесійнае (вытворча-практычнае) і дасугавае чытанне. Названыя віды чытання маюць спецыфіку і змест. Апошнія залежаць ад тыпалагічных і відавых асаблівасцей бібліятэкі – месца працы спецыяліста, а таксама перспектыў выкарыстання вынікаў чытання на працы, у тым ліку ў кантэксце павышэння прадукцыйнасці асобаснай і калектыўнай дзейнасці.

Разгледзім фактары, якія ўздзейнічаюць на самарэалізацыю бібліятэкара. Мы іх размеркавалі на некалькі груп:

– знешнія аб'ектыўныя (сацыяльна-эканамічная, сацыяльна-культурная і дэмаграфічная сітуацыя ў краіне, узровень адукаванасці насельніцтва і яго дабрабыт, тэхналагізацыя і інфарматызацыя грамадства, заканамернасці развіцця бібліятэчнай справы, узаемадзеянне бібліятэк з кнігагандлёвымі арганізацыямі і выдавецтвамі, мабільнасць рынку працы);

– знешнія суб'ектыўныя (кадравая палітыка органаў кіравання бібліятэчнай справай, разуменне ролі бібліятэкі і яе супрацоўнікаў у развіцці пэўнай тэрыторыі, населенага пункта, прадпрыемства, матывацыя і фінансавая падтрымка бібліятэчных калектываў, садзейнічанне ўкараненню інавацый у бібліятэчную вытворчасць);

– унутраныя аб'ектыўныя (арганізацыйная структура бібліятэкі, мэты і задачы яе дзейнасці, прафесійная стратыфікацыя, маральны і фізічны камфорт);

– унутраныя суб'ектыўныя (арганізацыйныя, сацыяльныя, прафесійныя, дэмаграфічныя і асобасныя) [10, с. 38–39], якія існуюць на ўзроўні арганізацыі і на ўзроўні асобы.

Улічваючы даволі складаную сітуацыю ў прафесійнай бібліятэчнай сферы, выкліканую абмежаваным фінансаваннем, адтокам спецыялістаў, скарачэннем колькасці бібліятэк [7; 8], трэба вылучыць шэраг умоў, неабходных для самарэалізацыі бібліятэкараў:

---

* Гэта інфармацыя агучана на пасяджэнні круглага стала «Кадравае забеспячэнне публічных бібліятэк Брэсцкай вобласці» 27.09.2013, г. Маларыта.

– індывідуальны дыферэнцыраваны падыход да арганізацыі метадычнай работы са спецыялістамі розных кваліфікацыйных катэгорый і пасад, выкарыстанне тэарэтычных дасягненняў педагогікі, псіхалогіі, андрагогікі, антрапалогіі, бібліятэказнаўства, інфарматыкі, менеджменту і маркетынгу і г.д. у мэтах павышэння прафесійнага ўзроўню супрацоўнікаў;

– спецыяльнае беспераппыннае навучанне бібліятэкараў, у тым ліку ў сістэме дадатковай прафесійнай адукацыі (школа маладога спецыяліста, школа дырэктараў, семінары-практыкумы, трэнінгі з элементамі майстар-класаў);

– пастаяннае адсочванне інавацый (тэхналагічных, сэрвісных, прадуктных) і стварэнне так званага інавацыйнага рэжыму функцыянавання бібліятэчнай установы;

– фарміраванне матывацыйнага асяроддзя ў структурных падраздзяленнях бібліятэкі, якое б садзейнічала самастойнай, творчай, навукова-даследчай рабоце персаналу;

– псіхалагічная падтрымка супрацоўнікаў (дапамога ў рэфлексіі, самаацэнцы, арганізацыі зносін у калектыве);

– выкарыстанне схемы дэлегавання паўнамоцтваў, каб супрацоўнік адчуваў павышэнне асабістай адказнасці за агульную справу, далучэнне да кіраўніцкай дзейнасці, каб у далейшым пазбегнуць карэнных пераўтварэнняў у сістэме кіравання бібліятэкай.

Падзяляючы думку навукоўцаў аб тым, што «самарэалізацыя праяўляецца ў пабудове і карэкціроўцы працэсу асобаснага развіцця, у ходзе якога максімальна раскрываецца і выкарыстоўваецца чалавечы патэнцыял суб'екта жыццядзейнасці» [3, с. 14], вылучым этапы самарэалізацыі спецыяліста ў бібліятэчнай справе:

– выбар прафесіі на падставе свядома пастаўленай мэты і распрацаваных тактыкі і стратэгіі для яе дасягнення згодна са здольнасцямі і схільнасцямі асобы;

– засваенне прафесіі, адаптацыя да прафесійнага соцыуму, далучэнне да пэўнай прафесійнай групы;

– непасрэдная прафесійная дзейнасць, якая прыносіць станоўчыя ці адмоўныя вынікі, мяняе статус спецыяліста ў бібліятэцы (кар'ерны рост), робіць яго экспертам у тым ці іншым кірунку бібліятэчнай работы ці, наадварот, прафесійная стагнацыя;

– прафесійнае настаўніцтва, здольнасць да перадачы прафесійнага вопыту, ведаў і ўменняў, аўтарытэт у маладых супрацоўнікаў;

– постпрафесійная дзейнасць, звязаная з рэфлексіяй і аналізам працоўнага шляху, выяўленнем, з аднаго боку, дасягненняў, а з другога – кірункаў прафесійнай нерэалізаванасці.

Як бачым, прафесійная самарэалізацыя ў бібліятэчнай справе разглядаецца ў працэсуальным і выніковым значэннях. Пры гэтым незалежна ад тыпалагічнай і відавой спецыфікі бібліятэкі самарэалізацыя становіцца аб'ектыўна патрэбным складнікам псіхалагічнага развіцця асобы ў кампетэнтнасным аспекце па такіх кірунках дзейнасці бібліятэчнага сацыяльнага інстытута, як практыка, навука, адукацыя, камунікацыя, кіраванне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Басов, С. А.* Библиотека в демократическом контексте / С. А. Басов // Научные и технические библиотеки. – 2006. – № 6. – С. 5–19.

2. *Бородина, В. А.* Профессиональное чтение библиотекаря: квалитологические и квалиметрические аспекты / В. А. Бородина // Библиотека и чтение в структуре современного образования : материалы Межрегион. науч. конф., Москва, 29 окт. 2009 г. / Рос. акад. образования, Науч. центр исследований книжной культуры РАН, Науч. пед. б-ка им. К. Д. Ушинского ; редкол.: В. П. Демин [и др.] ; отв. ред. Ю. П. Мелентьева. – М. : Наука, 2009. – С. 30–33.

3. *Горшкова, В. В.* Мотивационная сфера как условие самореализации взрослого человека / В. В. Горшкова, Т. А. Загривная // Человек и образование [Электронный ресурс]. – 2009. – № 2 (19). – С. 9–15. – Режим доступа: http://obrazovanie21.narod.ru/Files/2009-2_p009-015.pdf. – Дата доступа: 16.12.2013.

4. *Канатов, А. И.* Психологические проблемы оценки профессионально-личностного развития в образовании взрослого человека / А. И. Канатов // Человек и образование [Электронный ресурс]. – 2011. – № 4 (29). – С. 68–72. – Режим доступа: http://obrazovanie21.narod.ru/Files/2011-4_p068-072.pdf. – Дата доступа: 16.12.2013.

5. *Каптерев, А. И.* Модульный подход к формированию профессионально-квалификационной структуры библиотечных кадров / А. И. Каптерев // Проблемы подготовки специалистов в вузах культуры : сб. науч. тр. / Моск. гос. ин-т культуры. – М., 1990. – С. 97–106.

6. Профессиональная самореализация специалиста: концептуальный подход // Психология человека в современном мире, 2009 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://med-books.info/akmeologiya_770/professionalnaya-samorealizatsiya-spetsialista-38703.html. – Дата доступа: 08.12.2013.

7. *Рынкевіч, В. А.* Арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання насельніцтва / В. А. Рынкевіч // Публічныя бібліятэкі на пачатку XXI стагоддзя [Электронны рэсурс] : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; склад. В. А. Рынкевіч ; рэд. М. Г. Алейнік, А. Я. Іванова. – Электрон. дадзен. і прагр. (64 МБ). – Мінск, 2008. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

8. *Рынкевіч, В. А.* Сетка публічных бібліятэк: асноўныя паказчыкі дзейнасці і тэндэнцыі развіцця / В. А. Рынкевіч // Агляд дзейнасці бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2006–2010) [Электронны рэсурс] : зб. арт. / Нац. б-ка Беларусі ; рэд. Т. А. Ероха [і інш.] ; адк. за вып. В. А. Рынкевіч. – Электрон. тэкставыя дадзен. і прагр. (9,7 МБ). – Мінск, 2012. – 1 электрон. апт. дыск (CD-ROM).

9. *Стрелкова, И. Б.* Формирование кадровых ресурсов вузовских библиотек Республики Беларусь : автореф. дис. … канд. пед. наук : 05.25.03 / И. Б. Стрелкова ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2009. – 25 с.

10. *Стрелкова-Зыль, И. Б.* Кадровые ресурсы библиотек: теория и практика управления развитием : науч.-практ. пособие / И. Б. Стрелкова-Зыль. – М. : Литера, 2011. – 240 с. – (Совр. б-ка).


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. *Федосенко, Е. В.* Проблема самореализации профессионала в образовании / Е. В. Федосенко // Человек и образование [Электронный ресурс]. – 2011. – № 4 (29). – С. 40–43. – Режим доступа: http:// obrazovanie21.narod. ru/Files/2011-4_p040-043.pdf. – Дата доступа: 16.12.2013.

12. *Цвык, В. А.* Профессионализм: социально-философский анализ : автореф. дис. … д-ра филос. наук : 09.00.11 / В. А. Цвык ; Рос. ун-т дружбы народов. – М., 2004. – 47 с.

*J. PERAVERZEVA*

**THE PROBLEM OF A PROFESSIONAL'S SELF-REALIZATION IN THE LIBRARIANSHIP**

*Theoretic and methodological aspects of a professional librarian's self-realization at the present stage of the librarianship's development are disclosed. A professional librarian's self-realization is presented as a purposeful process of his professional skills' and personal qualities' realization. Factors influencing the process of self-realization of the librarians are described. Conditions and stages of a professional librarian's self-realization are covered.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 24.12.2013

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ